# Графічны напамін пра дваццатыя...

Зусім невялікі наклад — 99 экзэмпляраў — прымушае не прапусціць хаця б інфармацыйна выданне камплекта паштовак з серыі «Кніжная графіка Беларусі XX ст.» — «Віцебск у гравюрах 1920-х гадоў».

Выданне ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (асветніцкая ўстанова мае права на выдавецкую і паліграфічную дзейнасць). Сабраны рэпрадукцыі 16 графічных работ. Мэта творчага праекта пазначана ў заключных словах уступнага артыкула Алеся Сушы: «Дадзеным камплектам паштовак Нацыянальная бібліятэка Беларусі імкнецца паказаць мастацкую спадчыну шырокаму колу супольнасці, вярнуць яе ў навуковы і грамадскі ўжытак». Так, у свой час — у канцы 1920-х — графічныя набыткі Віцебска знайшлі адлюстраванне ў некалькіх кнігах-альбомах мастацтвазнаўцы Івана Фурманава. Выпуск ажыццявіла Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства. На досыць высокім для таго часу паліграфічным узроўні, але зусім невялікімі накладамі. Кнігі даўно зрабіліся прадметам цікавасці бібліяфілаў, гісторыкаў мастацтва, краязнаўцаў.

Алесь Суша ў сваім артыкуле зазначае: «Менавіта ў Віцебску паўстаў новы феномен у гісторыі айчыннай гравюры — адбылося вяртанне да старажытнай тэхнікі станковай ксілаграфіі (гравюры на дрэве), якая на доўгі час перад тым страціла папулярнасць і сваю ўласную мастацкую мову. У работах віцебскіх гравёраў 1920-х гадоў яна адрадзілася ў новых формах, спалучыла ў сабе традыцыі народнай культуры і найноўшыя падыходы мастацтва авангарда. Менавіта ксілаграфія віцебскім творцам бачылася найбліжэй звязанай з кнігай і найбольш прыдатнай для мастацкага адлюстравання беларускага жыцця».




У камплекце паштовак нас чакаюць сустрэчы з работамі Яўхіма Мініна («Стары Віцебск», «Ільінская царква ў Віцебску», «Касцёл святога Антонія», «Ускраіна Віцебска»), Зіновія Гарбаўца («Вадакачка ў Віцебску», «Віцебск з боку ракі Віцьбы»), Саламона Юдовіна («Дэманстрацыя», «На рынку», «Пахаванне», «Заручэўская сінагога», «Чорная Тройца», «Пескавацік», «Над Віцьбай», «Каля "Рынкавай"», «Касцёл святога Антонія»). Ёсць работы, якія адлюстроўваюць адзін і той жа аб'ект.

Ксілаграфія заўжды магнетызуе, само тэхнічнае вырашэнне стварае ўражанне іншай, багацейшай прасторы, хаця і няма ў гэтых работах гульні колераў.

Пасля знаёмства з камплектам паштовак з рэпрадукцыямі ксілаграфій відавочнымі падаюцца меркаванні наконт таго, што патрэбны сучасныя альбомы ўсіх трох мастакоў — С. Юдовіна, Я. Мініна і З. Гарбаўца. Іх творчая спадчына таго заслугоўвае.

**Мікола БЕРЛЕЖ**